# Старыя рэчы – новае жыццё

*У сталіцы з'явіліся кантэйнеры, дзе можна пакінуць непатрэбны тэкстыль*

Вераніка ШЫДЛОЎСКАЯ

**Кожны год тысячы тон тэкстылю трапляе на сметнікі. Адзенне, пасцельная бялізна, ручнікі ператвараюцца ў адходы, хоць нават пасля страты першапачатковага таварнага выгляду могуць быць карысныя. Каб змяніць падыход да іх утылізацыі, кампанія REMONDIS запусціла пілотны праект «Тэкстыль». У яго рамках будзе развівацца сістэма асобнага збору такіх вырабаў і іх перапрацоўка.**

**Генеральны дырэктар кампаніі REMONDIS Эрвін КУРТБЕДЗІНАЎ** лічыць, што беларусы ў частцы абыходжання з адходамі вельмі дысцыплінаваныя і сацыяльна адказныя.

– Праект не новы ў свеце, але новы ў нашай краіне. Той узровень, да якога мы імкнёмся, яшчэ ніхто не рэалізаваў, – падзяліўся ён. – Я даведаўся пра разнастайныя дэталі гэтай канцэпцыі, і год таму мы вырашылі, што надышоў час укараніць яе ў Беларусі.

Вопратку і іншыя вырабы, якія захавалі добрыя спажывецкія ўласцівасці, плануюць накіроўваць на дабрачыннасць, каб імі маглі скарыстацца тыя, каму яны патрэбны. Тэкстыль, непрыдатны для далейшага выкарыстання ў якасці адзення, можа ператварыцца ў рыззё – гэта спецыяльны матэрыял з лапікаў тканіны або тэкстыльных адходаў, прызначаны для ўборкі. Рэшткі тканіны плануецца накіроўваць на энергетычную ўтылізацыю і атрыманне RDF-паліва.

– Агітуючы людзей асобна здаваць тэкстыль, мы б хацелі падкрэсліць, што гэта магчымасць для кожнага паўдзельнічаць у вырашэнні глабальных праблем. Адразу сонца свяціць ярчэй не стане, але калі чалавек выканае некалькі простых дзеянняў, то зможа знізіць свой вуглярodны след, – сказаў начальнік аддзела экалогіі Вадзім ЗУБРЫЦКІ.

Ён падкрэсліў, што адзенне і тканіны могуць дзесяцігоддзямі распадацца на палігонах цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). Пры захаванні тэкстыльных адходаў утвараецца метан (парніковы газ, які ўплывае на клімат): ад адной тоны тэкстылю – у сярэднім ад 50 да 150 кг метану. Колькасць залежыць ад складу тканіны.

Асобны збор дазволіць не змешваць тэкстыль з бытавым смеццем і захаваць магчымасць яго далейшага выкарыстання. Тым менш адходаў адправіцца на палігоны і большая эканомія рэсурсаў для вытворчасці новых матэрыялаў.

- **Каб матэрыял захаваўся падчас збору і транспарціроўкі, трэба каб рэчы былі чыстымі, сухімі і шчыльна спакаванымі ў пластыкавы пакет. Абутак варта пакаваць асобна.**
- **У кантэйнеры можна здаваць любы тэкстыль – вопратку, пасцельную бялізну, ручнікі, коўдры, а таксама абутак.**

Спецыяльныя кантэйнеры выраблены з ацынкаванага металу, маюць замок і прыёмны люк. Канструкцыя дазваляе зручна здаваць рэчы, захоўваючы іх прыдатнасць для далейшага выкарыстання і перапрацоўкі.

***Зараз у Мінску ўстаноўлены чатыры кантэйнеры для тэкстылю. Іх можна знайсці па наступных адрасах:***

1. **вул. Касманаўтаў, 33.**
2. **вул. Лідская, 14.**
3. **вул. Кунцаўшчына, 17.**

Да сярэдзіны снежня плануецца ўсталяваць усе 50 кантэйнераў, прадугледжаных праектам на дадзеным этапе. Іх размяшчаюць у людных месцах – побач з крамамі, пешаходнымі дарожкамі і іншымі такімі лакацыямі. Кантэйнеры ўсталёўваюць асобна ад звычайных смеццевых бакаў, каб у іх не траплялі звычайныя камунальныя адходы.

Ключавыя адрозненні новага праекта, як адзначыла **кіраўнік праекта па тэкстылі Наталля ШАРАНГОВІЧ,** – гэта маштабнасць і лагістыка. У перспектыве плануецца размяшчэнне спецкантэйнераў не толькі ў сталіцы, але і ў абласных гарадах. Забіраць рэчы будуць асобна выдзеленыя машыны, каб не было змешвання з ЦКА і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. Таксама ёсць планы па стварэнні ўласнай вытворчасці рыззя і спецсарціроўкі.

У перспектыве з’явіцца інтэрактыўная карта, з дапамогай якой жыхары змогуць знаходзіць бліжэйшыя пункты збору тэкстылю. Чым больш людзей падключыцца да ініцыятывы, тым больш рэчаў атрымаецца накіраваць на дабрачыннасць, паўторнае выкарыстанне і перапрацоўку.

